ДУК «БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА ХОЦІМСКАГА РАЁНА»
Бяседавіцкая бібліятэка флоры і фаўны



# Уладзімір Караткевіч – чалавек, які носіць сваё неба з сабою

**Віртуальная выстава**

# ВЫСТАВА ПРЫСВЕЧАНА ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

*Быў.Ёсць.Буду…*
*З сэрцам за волю распятым*
*Сынам сваёй Беларусі,*
*Годным і сонечна вартным.*
*Быў. Ёсць. Буду*
*Роднаму слову адданым,*
*Сумленне своё не засмуціш*
*Прызваннем ад неба абраным.*
*Быў. Ёсць. Буду*
*Рыцарам зорнае праўды,*
*Любові сваёй не астудзіш*
*Ні кропляй халоднай пагарды.*
*Быў. Ёсць. Буду*
*Сёння, і заўтра, і вечна…*
*І пра быццё сваё мусіш*
*Душам адкрыць чалавечнасць.*

Таццяна Тамашэвіч



26.11.1930 - 25.07.1984

26 лістапада 1930 г. нарадзіўся адзін з най больш яркіх і самабытных прадстаўнікоў беларускай літаратуры Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч, заснавальнік нацыянальнага гістарычнага рамана. Ён плённа працаваў як паэт, празаік, драматург, эсэіст, публіцыст, літаратурны крытык, перакладчык і сцэнарыст. Стаў першым беларускім пісьменнікам, які пачаў пісаць у жанры гістарычнага дэтэктыву. Караткевіч істотна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў тэматычных і жанравых адносінах, напоўніў яе інтэлектуальным і філасофскім зместам.

Творчасць Уладзіміра Караткевіча, народжанная болем за родны край , пакутамі за яго гісторыю, народжанная ў крытычныя для беларусчыны гада, і ў наш час гучыць надзённа, і ў нашыя дні выклікае сардэчны боль, вярэдзіць сумленне, мацуе веру.

Віртуальная кніжная выстава ўключае як літаратуру аб жыцці і творчай дзейнасці знакамітага пісьменніка, так і мастацкія творы пісьменніка і мае наступныя раздзелы:

«Уладзімір Караткевіч у літаратуразнаўстве і крытыцы»

«Творчая спадчына класіка»

# Уладзімір Караткевіч у літаратуразнаўстве і крытыцы

















Уладзімір Караткевіч : вядомы і невядомы : зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў / уклад. : А. Верабей, М. Мінзер, С. Панізік. — Мінск : Літаратура і мастацтва, 2010. — 368 с.

ISBN 978- 985-6941—76-7
ББК 83.3 (4 Беи)
К21

Кніга нагадвае сяброўскую сагу пра вялікага і легендарнага пісьменніка, пра чалавека, чые ўплывы на грамадскую думку, на фарміраванне светапогляду сучасніка працягваваюцца і цяпер. Першую частку зборніка складае эсэ празаіка паэта, літаратуразнаўца Алега Лойкі «Уладзімір Караткевіч або паэма Гарсія Лойкі». Другая частка зборніка «Белая песня ў лугах залацістых…», дзе ўпершыню надрукаваны паэтычныя творы самаго У. Караткевіча на беларускай і рускай мовах. Трэццюю частку кнігі склалі вершы, ўрыўкі з паэм, эсэ, вытрымкі з нарысаў, крытычных артыкулаў як беларускіх, так і замежных пісьменнікаў, іншыя матэрыялы, прысвечаныя Уладзіміру Караткевічу.

Бельскі, А. І. Экзатычныя краявіды ў паэзіі Адама Міцкевіча і Уладзіміра Караткевіча / А. І. Бельскі // Галасы і вобразы : літ.-крытычныя артыкулы / А. І. Бельскі. — Мінск, 2008. — С. 17—22.

ISBN 978- 985-6720—38-6
ББК 83.3 (4 Беи)
Б43




Крытык, доктар філалагічных навук Алесь Бельскі запрашае ў духоўны космас беларускай паэзіі каб адкрыць багацце нацыянальнай канкрэтыкі, хараство родных вобразаў, пачуць непаўторныя і адметныя галасы песняроў бацькоўскай зямлі. Адзін з артыкулаў гэтага выдання прысвечаны Уладзіміру Караткевічу, як паэту.

Выданне разлічана на выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, навукоўцаў, настаўнікаў, старшакласнікаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускай літаратуры і яе развіццём.

**Андраюк, С. На рамантычнай хвалі / Сямён Андраюк // Пісьменнікі, кнігі : літ.-крытычныя артыкулы : для старэйшага школьнага ўзросту / С. Андраюк. — Мінск, 1997. — С. 302—310.**

**ISBN 985 - 02—0360 -9.**
**ББК 83.3 (4 Беи)6**
**А65**




**Серафім Андраюк – крытык, які за ўсё сваё творчае жыццё з вялікай пашанай ставіцца да духоўнага скарбу свайго народа.**

**У гэту кнігу ўвайшлі артыкулы пра вядомых беларускіх пісьменнікаў.**

**У. Караткевічу прысвечаны два з іх: «На рамантычнай хвалі» – аб аповесці «Чазенія» і «Трагедыя і слава» – пра вядомы ўсім раман «Каласы пад сяртом тваім».**



*На рамантычнай хвалі*

(УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ. ЧАЗЕНІЯ. 1970)

Аповесць У. Караткевіча «Чазенія», надрукаваная на рускай мове ў часопісе «Молодая гвардия», выклікала выключную цікавасць у чытача. Асабліва многа пісьмаў прыйшло з Поўначы, Далёкага Усходу, ад маракоў. Ёсць у гэтым нейкая свая, глыбокая ўнутраная неабходнасць. Тут не выяўленне «мясцовага патрыятызму»: падзеі твора адбываюцца на Далёкім Усходзе. Чытач у творы Караткевіча знайшоў нешта блізкае свайму светаадчуванню і светаразуменню, унутрана сугучнае свайму жыццю. Гэтае «нешта» — высокага напалу рамантычнасць. Тая рамантычнасць, якая ідзе ад разумення і адчування невычэрпнага багацця і хараства жыцця, ад яго непаўторнасці і выключнасці. Праўда, сам пісьменнік чамусьці адмахваецца ад рамантычнасці. У адкрытым пісьме чытачам «Молодой гвардии» ён піша: «Цяпер пра яркае і надзвычай прыгожае. У некаторых пісьмах гаварылася нават пра рамантыку. Глупства гэта. Усё гэта ў мяне звычайная рэальнасць. Толькі трэба бачыць гэтую рэальнасць дзіўнай, выключнай». Магчыма, для пісьменніка, як ён піша, і сапраўды ўсё гэта «звычайная рэальнасць». Але для чытача ўсё, пра што піша Караткевіч, незвычайнае, выключнае, яркае. У жыцці менавіта гэта найбольш вабіць пісьменніка, менавіта гэта ён умее найлепш узнаўляць у сваіх творах.

Перачытваючы розныя паводле часу напісання празаічныя творы са зборніка «Чазенія», пераконваешся яшчэ раз у тым, што Караткевіч — пісьменнік пераважна рамантычнага складу, рамантычнага ўспрыняцця свету.

У яго яркія характары, выключныя жыццёвыя факты, рамантызаваныя абставіны, незвычайна завостраныя канфлікты, барацьба страсцей, метафарычнасць, багатая вобразнасць, уменне стварыць эмацыянальную напружанасць, узвышаныя эмацыянальныя словы, багатыя, яркія фарбы.

302

**Верабей, А.** Абуджаная памяць : нарысы пра жыццё і творчасць У. Караткевіча / Анатоль Верабей. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. — 256 с., [8] л. іл.

ISBN 985 - 02—0259-9.
ББК 83.3 (4 Беи)
В 31




У кнізе, выкарыстоўваючы архіўныя матэрыялы, эпісталярную спадчыну Уладзіміра Караткевіча і ўспаміны пра яго, асэнсоўваецца постаць гэтага самабытнага і арыгінальнага творца. Засяроджваецца ўвага на характарыстыцы ягонай паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыцы і мастацкага перакладу, прасочваецца творчая эвалюцыя пісьменніка, даследваецца праблематыка і жанрава-стылёвая асаблівасць твораў.

# Творчая спадчына класіка



Караткевіч, У. Каласы пад сярпом тваім : раман для старэйшага школьнага ўзросту / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 814 с. — (Бібліятэка школьніка).

ISBN 978- 985- 02- 0879-8
ББК Бел2
К21




«Каласы пад сярпом тваім» – адзін з найлепшых гістарычных раманаў у беларускай літаратуры. Уладзімір Караткевіч па-майстэрску ўзнаўляе панараму жыцця края напярэдадні паўстання 1863 года. Чытач трапляе ў магнацкі палац і сялянскую хату, ў гімназічны клас і на вялікасвецкі баль і разам з галоўным героем рамана Алесем Загорскім адкрывае для сябе прыгажосць веліч і трагедыю сваёй радзімы – Беларусі.

**Караткевіч, У.** Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць ; Зямля пад белымі крыламі : нарыс для старэйшага школьнага ўзросту / Уладзімір Караткевіч ; прадм. А. Расінскага. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 493с. — (Бібліятэка школьніка).

ISBN 978- 985- 02- 0967-2
ББК 84(4Бел)
К21




У славутым гатычным дэтэктыве «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Караткевіч стварыў незабыўны, таямнічы і загадкавы вобраз беларускай мінуўшчыны. Падзеі аповесці адбываюцца ў канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя. Вучоны-фалькларыст Андрэй Бялецкі трапляе ў маёнтак Балотныя Яліны, дзе становіцца сведкам незвычайных здарэнняў. Страх на ўсё наваколле наганяе дзікае паляванне караля Стаха, пад час якога быў забіты бацька Надзеі Яноўскай, сучаснай ўладальніцы маёнтка…

«Зямля пад белымі крыламі» – гэта сціплы і займальны аповед пра рэальную беларускую гісторыю.

Караткевіч, У. Чорны замак Альшанскі : раман для старэйшага школьнага ўзросту / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. — 382 с. — (Бібліятэка школьніка).

ISBN 978- 985- 02- 1253-5
ББК 84(4 Бел)
К21




Раман «Чорны замак Альшанскі» – адзін з найпапулярнейшых твораў Уладзіміра Караткевіча – напісаны ў жанры гістарычнага дэтэктыва, які ў апошняе дзесяцігоддзе стаў лідарам сусвенай літаратуры.

Гісторыя рамана сыходзіць каранямі ў глыбокую старажытнасць – 15 стагоддзе. У тыя далёкія і смутныя часы князь Альшанскі крадзе скарб і каштоўнасці паўстанцаў, але раптам памірае, пакуінуўшы манускрыпт, у якім паказана месцазнаходжанне скарбаў...

Караткевіч, У. Хрыстос прызямліўся ў Гародні : раман / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : «Беллітфонд», 2000. — 496 с.

ISBN 985- 6576- 14-8
ББК Бел2
К21




Раман выдатнага беларускага пісьменніка XX стагоддзя Уладіміра Караткевіча ўваскрашае падзеі далёкага сярэдневечча, расказвае пра змаганне беларускага народа супраць антычалавечных феадальных парадкаў і царкоўнага дагматызму. Займальны сюжэт, вобразная, перасыпаная народным гумарам мова твора – якасці, якія без сумніву, прывабяць чытача.

«Хрыстос прызямліўся ў гародні» распачынае вялікую кніжную серыю – «Беларускі гістарычны раман».

Караткевіч, У. Чазенія : апавяданні і аповесць : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Уладзімір Караткевіч ; прадм. Дз. Бугаёў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 398 с. — (Бібліятэка школьніка).

ISBN 978- 985- 02- 0956-6
ББК 84Бел2
К21




У кнігу народнага пісьменніка Беларусі Уладзіміра Караткевіча ўвайшлі аповесць «Чазенія» і такія апавяданні, як «паром на бурнай рацэ», «Сіня, сіняя…», «Кніганошы» і іншыя. Творы прасякнуты любоўю да прыроды і гісторыі роднай Беларусі, у іх апяваецца хараство і духоўная прыгажосць чалавека.

У аповесці «Чазенія» пісьменнік услаўляе духоўныя Каштоўнасці – сяброўства, каханне, вернасць, а таксама апавядае пра нялёгкі маральны выбар закаханых людзей.

Караткевіч, У. На Беларусі бог жыве... : вершы , паэмы / Уладзімір Караткевіч ; уклад. В. Шніпа. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008 — 254 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN978- 985- 02-0985-6
ББК Бел2
К21




У кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча ўвайшлі паэтычныя творы, якія даўно сталі класікай беларускай літаратуры. Яны вызначаюцца рамантычнай ўзнёсласцю і грамадзянскай страснасцю, нечаканай вобразнасцю і глыбінёй зместа.




# Дзякуй за ўвагу!







